ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК [94+27-67-9](476) “1863/1914”(043.3)

Кароль
Маргарыта Міхайлаўна

# Перавод каталіцкага насельніцтва Беларусі ў праваслаўе (1863–1914 гг.)

Аўтарэферат дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.02 – «Айчынная гісторыя»

Мінск 2021

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Навуковая работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

| | |
|---|---|
| Навуковыя кіраўнікі: | **Касцюк Міхаіл Паўлавіч**,<br>акадэмік, доктар гістарычных навук, прафесар;<br><br>**Максімчык Андрэй Мікалаевіч**,<br>кандыдат гістарычных навук, дацэнт,<br>дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага<br>і навейшага часу<br>Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. |
| Афіцыйныя апаненты: | **Лаўрыновіч Дзмітрый Сяргеевіч**,<br>доктар гістарычных навук, прафесар,<br>першы прарэктар УА «Магілёўскі дзяржаўны<br>ўніверсітэт імя А. А. Куляшова»;<br><br>**Яноўская Валянціна Васільеўна**,<br>кандыдат гістарычных навук, дацэнт. |
| Апаніруючая арганізацыя – | УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт<br>імя Янкі Купалы». |

Абарона адбудзецца «20» студзеня 2022 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.05 пры Беларускім дзяржаўным ўніверсітэце па адрасе: 220030, Мінск, вул. Ленінградская, 8 (корпус юрыдычнага факультэта), аўд. 407.
Тэлефон вучонага сакратара: 209-57-09.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы «__» снежня 2021 г.

Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый
доктар гістарычных навук прафесар А.А. Гужалоўскі

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



# УВОДЗІНЫ

Рэспубліка Беларусь з’яўляецца прыкладам міжканфесійнага міру і ўзаемапаразумення, дзяржавай, у якой адносіны паміж асобнымі рэлігійнымі супольнасцямі, а таксама іх узаемадзеянне з дзяржаўнымі інстытутамі і грамадствам грунтуюцца на прынцыпах супрацоўніцтва, дыялогу і адкрытасці. Такое становішча шмат у чым абумоўлена гістарычным развіццём Беларусі. На яе тэрыторыі традыцыйна суіснавалі розныя рэлігійныя групы, самымі масавымі з якіх з’яўляліся праваслаўныя і каталікі. Пры гэтым у розныя перыяды ў мінулым праваслаўная і каталіцкая канфесіі займалі неаднолькавае становішча ў грамадстве. У часы існавання Рэчы Паспалітай (другая палова XVI–XVIII стст.) пры колькаснай перавазе праваслаўнага, а затым уніяцкага насельніцтва каталіцызм меў статус пануючай рэлігіі. Сітуацыя пачала змяняцца пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. Новыя ўлады імкнуліся ўмацаваць пазіцыі праваслаўнай царквы, якая ў адрозненне ад каталіцтва ўспрымалася як цалкам лаяльная дзяржаве. Змены ў статусе каталіцызму і праваслаўя сталі адным з фактараў, якія прывялі да масавых канфесійных канверсій у другой палове XIX – пачатку XX ст. Таму даследаванне працэсу пераводу каталікоў у праваслаўе дазваляе глыбей зразумець міжканфесійныя адносіны на тэрыторыі беларускіх губерняў.

Навязаная зверху змена канфесійнай прыналежнасці выклікала рэакцыю насельніцтва, якая часта праяўлялася ў імкненні захаваць (адкрыта ці таемна) прыналежнасць да каталіцызму. Гэта прывяло да ўзнікнення феномена «ўпартых у лацінстве» («упорствующих в латинстве») – асоб, якія працягвалі прытрымлівацца каталіцкага веравызнання, нягледзячы на тое, што фармальна з’яўляліся праваслаўнымі. У некаторых мікрарэгіёнах (воласці, прыходы, сельскія грамады) людзі, якія выконвалі каталіцкія абрады насуперак вонкавай прыналежнасці да праваслаўя, складалі істотную частку насельніцтва. Працэс змены канфесіі (канверсія) атрымліваў больш шырокае сацыяльнае напаўненне, да «ўпартых у лацінстве» была прыцягнута пільная ўвага мясцовай свецкай і царкоўнай адміністрацыі. У выніку ўзаемаадносіны паміж свецкай і царкоўнай адміністрацыяй і пераведзеным у праваслаўе насельніцтвам складалі істотную частку грамадскага і рэлігійнага жыцця ў беларускіх губернях у другой палове XIX – пачатку XX ст.

Пад паняццем «канфесійная канверсія» ў тэксце разумеецца змена рэлігійнай прыналежнасці як асобнымі людзьмі (канвертытамі), так і рэлігійнымі грамадамі (або іх часткай). У адрозненне ад нешматлікіх добраахвотных канверсій перавод каталіцкага насельніцтва Беларусі ў

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



праваслаўе, які ажыццяўляўся ў другой палове XIX ст., набыў масавы характар і з'яўляўся часткай рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі.

**Геаграфічныя межы** даследавання ахопліваюць сучасную тэрыторыю Рэспублікі Беларусь і ўключаюць у сябе Мінскую, Магілёўскую, а таксама шэраг паветаў Віцебскай (Віцебскі, Гарадоцкі, Дрысенскі, Лепельскі, Полацкі), Гродзенскай (Гродзенскі, Брэсцкі, Ваўкавыскі, Кобрынскі, Пружанскі, Слонімскі), Віленскай (Ашмянскі, Вілейскі, Дзісенскі, Лідскі, Свянцянскі) губерняў, а таксама Новааляксандраўскі павет Ковенскай губерні, тэрыторыя якіх поўнасцю або часткова ўваходзіць у Рэспубліку Беларусь.

**Храналагічныя рамкі** даследавання ўключаюць у сябе перыяд 1863–1914 гг. У якасці ніжняй храналагічнай мяжы даследавання абраны 1863 г. – год пачатку паўстання 1863–1864 гг., якое выклікала грамадскі рэзананс, абвастрыла рэлігійныя адносіны, у выніку чаго пачалі прымацца абмежавальныя ўказы ў дачыненні да каталіцкай царквы. Верхняя мяжа абумоўлена пачаткам Першай сусветнай вайны і зменамі ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі, у гэтых абставінах палітыка дзяржавы ў сферы рэлігіі адышла на другі план.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з навуковымі праграмамі, тэмамі

Дысертацыйнае даследаванне выканана ў адпаведнасці з НДР «Сацыяльныя змены ў грамадстве ва ўмовах капіталістычнай трансфармацыі эканомікі Беларусі (1864–1914 гг.)» (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20161683), якая выконвалася ў 2016–2020 гг. на кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў межах дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства», падпраграма «Гісторыя і культура».

### Мэта і задачы даследавання

**Мэта даследавання** – раскрыццё працэсу ажыццяўлення канфесійных канверсій праваслаўнага і каталіцкага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў 1863–1914 гг.

У адпаведнасці з акрэсленай мэтай даследавання вызначаюцца наступныя **задачы**:

- адлюстраваць практыку пераводу каталікоў у праваслаўе як частку канфесійнай палітыкі расійскіх улад;

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



- выявіць формы супраціўлення з боку насельніцтва пераводу ў праваслаўе (60-я гг. XIX ст.) і рэакцыю дзяржаўнай адміністрацыі на адмову вызнаваць праваслаўе;
- прасачыць шляхі захавання насельніцтвам былой канфесійнай ідэнтычнасці пасля намінальнага пераводу ў праваслаўе (70-я гг. XIX ст. – пачатак XX ст.);
- вызначыць уплыў Указа «Аб умацаванні асноў верацярпімасці» ад 17 красавіка 1905 г. на канфесійную сітуацыю ў Беларусі;
- вызначыць асноўныя вынікі і наступствы канфесійных канверсій у Беларусі ў 1863–1914 гг., колькасць пераведзенага ў праваслаўе каталіцкага насельніцтва.

**Аб’ект** даследавання – канфесійная палітыка Расійскай імперыі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

**Прадмет** даследавання – рэлігійныя канверсіі насельніцтва Беларусі ў 1863–1914 гг. на прыкладзе пераводу каталікоў у праваслаўе.

## Навуковая навізна

Навуковая навізна даследавання заключаецца ў тым, што ў ім на падставе шырокага кола крыніц (нарматыўныя прававыя акты, справаводства органаў свецкай і царкоўнай адміністрацыі, матэрыялы перыядычнага друку, мемуарная літаратура) упершыню ў гістарыяграфіі ўсебакова акрэслены асаблівасці пераводу каталіцкага насельніцтва ў праваслаўе на тэрыторыі беларускіх губерняў у 1863–1905 гг.; вызначаны колькасны склад пераведзеных у праваслаўе, прааналізаваны працэс вяртання ў каталіцызм часткі пераведзеных у 1905–1914 гг.; выяўлены спосабы негвалтоўнага супраціўлення насельніцтва пераводам, вызначаны рэгіёны, дзе адзначалася масавае супраціўленне пераводу ў праваслаўе. Упершыню ў айчыннай гістарычнай навуцы вылучаны і разгледжаны формы захавання пераведзенымі ў праваслаўе традыцыйнай для іх каталіцкай канфесійнай ідэнтычнасці, адзначана яе трываласць, прасочаны выпадкі яе наяўнасці на працягу доўгага перыяду пасля фармальнага пераводу ў праваслаўе. У працэсе выканання дысертацыйнага даследавання праведзена комплекснае вывучэнне дакументаў з архіваў Беларусі, Літвы і Расіі, частка з якіх упершыню прааналізавана і ўведзена ў навуковы ўжытак.

## Палажэнні, якія выносяцца на абарону

1. У перыяд пасля паўстання 1863–1864 гг. істотным напрамкам канфесійнай палітыкі расійскіх улад у беларускіх губернях стаў перавод часткі каталіцкага насельніцтва ў праваслаўе. Мерапрыемствы па пераводзе былі накіраваны на ўмацаванне пазіцый праваслаўнай царквы за кошт мінімізацыі

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



польскага і каталіцкага ўплыву, а таксама на ажыццяўленне канфесійнай гамагенізацыі і ўніфікацыі беларускіх губерняў з унутранымі губернямі Расійскай імперыі. Перавод як цэласны напрамак канфесійнай палітыкі быў ініцыяваны прадстаўнікамі царкоўнай і свецкай улады, а не непасрэдна вернікамі. Гэта адрознівала яго ад добраахвотных пераходаў з каталіцтва ў праваслаўе, якія адбываліся на працягу XIX – пачатку XX ст. і былі абумоўлены як асабістымі рэлігійнымі перакананнямі, так і жаданнем прадэманстраваць лаяльнасць да ўлад з боку канвертытаў. Працэдура пераводу фармальна рэгулявалася існуючымі на той момант заканадаўчымі актамі, для пацвярджэння прыняцця праваслаўя ў канвертытаў браліся падпіскі. Але далучэнні адбываліся з парушэннем норм свецкага і царкоўнага права, што найперш праяўлялася ў адсутнасці добраахвотнасці пры пераводзе. Падобныя канверсіі мелі як адзінкавы, так і масавы характар, калі ў праваслаўе пераводзіліся цэлыя вёскі і парафіі.

2. Парушэнні пры пераводзе у праваслаўе ў выглядзе адсутнасці ў шэрагу выпадкаў добраахвотнасці выклікалі праявы супраціўлення з боку пераведзеных. Былыя каталіцкія вернікі масава адмаўляліся выконваць праваслаўныя абрады і наведваць цэрквы. Распаўсюджанай формай супраціўлення пераводу з’яўлялася падача скаргаў і прашэнняў на імя прадстаўнікоў вышэйшай адміністрацыі з мэтай атрымаць дазвол вызнаваць каталіцызм. Непадпарадкаванне з боку пераведзеных насіла негвалтоўны характар. Канфлікты на рэлігійнай глебе не былі шматлікімі і мелі прыкметы міжасабовых інцыдэнтаў. Распаўсюджанымі формамі схілення да вызнавання праваслаўя з’яўляліся пастырскі або паліцэйскі нагляд, штрафы, нават турэмнае зняволенне і высылка. Улады імкнуліся выяўляць ініцыятараў і падбухторшчыкаў да непадпарадкавання, у якасці якіх разглядаліся каталіцкія святары і памешчыкі каталіцкага веравызнання.

3. Намаганні пераведзеных у праваслаўе атрымаць ад улад дазвол на вяртанне ў каталіцызм заканчваліся безвынікова, пераведзеныя заставаліся фармальна прыналежнымі да праваслаўя. Гэта прыводзіла да таго, што яны працягвалі таемна вызнаваць каталіцызм і захоўваць адпаведную рэлігійную ідэнтычнасць, што выяўлялася ў самастойным выкананні каталіцкіх рэлігійных абрадаў, наведванні касцёлаў у іншых мясцінах, адмове ўдзельнічаць у праваслаўных набажэнствах і выконваць праваслаўныя абрады, шанаванні месцаў традыцыйнай рэлігійнасці (перш за ўсё, былых каталіцкіх капліц), наданні народжаным дзецям імёнаў, характэрных для заходняй хрысціянскай традыцыі. Захаванне каталіцкай канфесійнай ідэнтычнасці часткай пераведзеных у праваслаўе прасочваецца на працягу ўсяго перыяду, які

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



даследуецца. Асабліва выразна яно праяўлялася ў мікрарэгіёнах, дзе каталіцызм традыцыйна меў трывалыя пазіцыі.

4. На рэлігійнае становішча ў беларускіх губернях істотна паўплывала выданне 17 красавіка 1905 г. Указа «Аб умацаванні асноў верацярпімасці». Ва ўмовах нарастання грамадска-палітычных супярэчнасцей у пачатку XX ст. улада была зацікаўлена ў пашырэнні колькасці лаяльных да сябе людзей рознай канфесійнай прыналежнасці. Нягледзячы на недасканала акрэсленую працэдуру пераводу, Указ здымаў ранейшую забарону на пераход з праваслаўя ў іншыя хрысціянскія канфесіі. У выніку канверсіі дастаткова шырока адбываліся ў беларускіх губернях у перыяд да пачатку Першай сусветнай вайны. Масавыя вяртанні ў каталіцызм былі характэрны для тэрыторый, дзе ў сярэдзіне 60-х гг. XIX ст. ажыццяўляліся пераводы ў праваслаўе, закрываліся касцёлы і каталіцкія капліцы. Адносіны да пераведзеных у праваслаўе і іх імкнення вярнуцца ў каталіцызм адрозніваліся ў залежнасці ад грамадска-палітычнай скіраванасці. Чыноўнікі і праваслаўныя дзеячы ацэньвалі іх як людзей, пазбаўленых трывалых рэлігійных перакананняў, а іх нежаданне заставацца ў праваслаўі тлумачылі прапагандай з боку каталіцкага духавенства і шляхты.

5. Перавод часткі каталіцкага насельніцтва ў праваслаўе прывёў да змен у канфесійнай структуры насельніцтва беларускіх губерняў. На працягу другой паловы XIX ст. колькасць праваслаўных у параўнанні з каталікамі ўзрасла ў тым ліку за кошт асоб, якія да сярэдзіны 60-х гг. XIX ст. вызнавалі каталіцызм. Аднак былыя каталіцкія вернікі ўтваралі асобную групу ў межах праваслаўнай канфесійнай супольнасці, яны адмаўляліся выконваць абрады новай канфесіі, насуперак фармальнай прыналежнасці да праваслаўя працягвалі лічыць сябе каталікамі. У шэрагу выпадкаў падобнае непрыняцце праваслаўнай канфесійнай ідэнтычнасці доўжылася на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў і пратрымалася да пачатку XX ст., калі пасля выдання Указа «Аб умацаванні асноў верацярпімасці» (1905 г.) пераведзеныя ў праваслаўе каталікі атрымалі легальную магчымасць вярнуцца ў заходні абрад.

## Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені

Дысертацыя з’яўляецца ўласным даследаваннем саіскальніка, палажэнні і высновы якога атрыманы самастойна. У дысертацыйным даследаванні акрэслена і ахарактарызавана працэдура пераводу часткі каталіцкага насельніцтва беларускіх зямель у праваслаўе ў 60-я гг. XIX ст., выяўлена рэакцыя пераведзеных на змену веравызнання. На падставе шырокага кола крыніц вызначаны формы і шляхі захавання насельніцтвам каталіцкай ідэнтычнасці ва ўмовах фармальнай прыналежнасці да праваслаўнай канфесіі. Асаблівая ўвага звернута на лакальны ўзровень супраціўлення пераводам –

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



дзейнасць «упартых у лацінстве» ў асобных валасцях, прыходах, вёсках. Выяўлены і ахарактарызаваны змены ў становішчы пераведзеных у праваслаўе пасля выдання Указа «Аб умацаванні асноў верацярпімасці» (1905 г.), паводле якога яны атрымалі магчымасць вярнуцца ў каталіцызм.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Вынікі дысертацыйнага даследавання прадстаўлены на 19 навуковых канферэнцыях: IV Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Актуальные проблемы источниковедения» (г. Віцебск, 20–21 красавіка 2017 г.); XIX Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя маладых вучоных (г. Брэст, 12 мая 2017 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў, аспірантаў і маладых вучоных «XI Машэраўскія чытанні» (г. Віцебск, 18 кастрычніка 2017 г.); Навукова-практычныя канферэнцыі «Долгий XIX век в истории Беларуси и Восточной Европы» (г. Мінск, 19–20 кастрычніка 2017 г., 2–3 лістапада 2018 г., 12–13 снежня 2019 г.); XII Карэліцкія краязнаўчыя чытанні «Штодзённасць жыхароў Карэліцкага рэгіёна X–XX стст.» (г. п. Карэлічы, 10 лістапада 2017 г.); Усерасійская навукова-практычная канферэнцыя «Студенческое сообщество и современная наука» (г. Ялец, Расійская Федэрацыя, 6–12 красавіка 2018 г.); IV Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў» (г. Полацк, 19–20 красавіка 2018 г.); 75-я навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў БДУ (г. Мінск, 16 мая 2018 г.); Навукова-практычная канферэнцыя «Беларускія архівы на мяжы тысячагоддзяў: здабыткі і страты» (г. Мінск, 28 чэрвеня 2018 г.); II канферэнцыя маладых даследчыкаў «Ars longa: навуковыя дасягненні, праекты, перспектывы» (г. Мінск, 4–5 красавіка 2019 г.); 76-я навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў БДУ (г. Мінск, 22 мая 2019 г.); Рэспубліканская навуковая канферэнцыя «Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XX стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы» (г. Гомель, 3 кастрычніка 2019 г.,); Міжнародная навуковая канферэнцыя «Праваслаўе ў Беларусі XIX–XX стст.» (г. Мінск, 1 лістапада 2019 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларусь у эпоху геапалітычных і сацыяльных зрухаў Новага і Навейшага часу» (г. Мінск, 22 лістапада 2019 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: грамадства, дзяржава, асоба» (г. Гродна, 12–13 снежня 2019 г.); Навукова-практычная канферэнцыя «Гісторыка-культурная спадчына Лідчыны» (г. Ліда, 18 верасня 2020 г.); IX міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Гальшанскія чытанні.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



Канфесійнае жыццё Ашмяншчыны X–XX стст.» (аг. Гальшаны, 30 кастрычніка 2020 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні і высновы дысертацыі надрукаваны ў 20 навуковых работах, з іх 7 у навуковых выданнях у адпаведнасці з п. 18 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь (5,5 а.а.), 2 артыкулы ў іншых навуковых выданнях, 11 – у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Структура дысертацыйнага даследавання абумоўлена мэтай і задачамі і складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі працы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса, 15 дадаткаў на 30 аркушах. Агульны аб'ём працы – 195 аркушаў. Бібліяграфічны спіс на 31 аркушы складае 388 пазіцый, у тым ліку 20 публікацый аўтара.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

У першай главе **«Гістарыяграфія, крыніцы і метады даследавання»** раскрываецца ступень распрацаванасці праблемы, аналізуюцца крыніцы, характарызуюцца выкарыстаныя ў даследаванні метады.

У раздзеле *1.1 «Гістарыяграфія праблемы даследавання»* вызначаны актуальны стан вывучэння пераводу каталіцкага насельніцтва ў праваслаўе ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Вылучаны этапы развіцця гістарыяграфіі, прысвечанай дадзенай праблематыцы. На працягу першага з іх (канец XIX – пачатак XX ст.) гэтае пытанне асэнсоўвалася сучаснікамі падзей. Для наступнага этапу (20–80-я гг. XX ст.) была характэрна слабая ўвага да вывучэння канфесійнага жыцця ў Беларусі. Трэці этап, які пачаўся ў 90-я гг. XX ст., адрозніваецца ўзрастаннем цікавасці да праблематыкі рэлігійных канверсій, што абумоўлена агульным павелічэннем навуковага і грамадскага інтарэсу да рэлігійных аспектаў мінулага Беларусі.

На першым з акрэсленых этапаў даследчыкі, якія займаліся вывучэннем практыкі канфесійных канверсій у беларускіх губернях, пераважна ацэньвалі яе станоўча. Яны лічылі, што перавод у праваслаўе ажыццяўляўся добраахвотна і садзейнічаў вяртанню праваслаўю дамінуючай ролі ў рэлігійным жыцці беларускіх зямель (П. М. Бацюшкаў, Р. Я. Кіпрыяновіч, А. І. Мілавідаў)[1]. Тым не

[1] Белоруссия и Литва: исторические судьбы Северо-Западного края : с одной хромолитографией, 99 гравюрами и картой / с высочайшего соизволения изд. при М-ве внутр. дел П. Н. Батюшковым. – СПб. : Тип. Т-ва

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## Спіс публікацый саіскальніка вучонай ступені

### Артыкулы ў навуковых выданнях у адпаведнасці з п. 18 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь

1. Кароль, М. М. Канфесійная «ўнутраная эміграцыя» сялянства Мінскай губерні як рэакцыя на палітыку русіфікацыі ў апошняй трэці XIX ст. / М. М. Кароль // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. – Мінск, 2016. – Вып. 14. – С. 254–268.

2. Кароль, М. М. Супраціўленне пераводу ў праваслаўе каталіцкага насельніцтва беларускіх губерняў пасля паўстання 1863–1864 гг.: дзейнасць «падбухторшчыкаў» і рэакцыя ўлад / М. М. Кароль // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. – Мінск, 2017. – Вып. 15. – С. 233–247.

3. Кароль, М. М. «Цяпер дадзена свабода ад Гасудара і кожны свабодную можа вызнаваць веру»: паўсядзённыя практыкі міжканфесійных канверсій пасля прыняцця Указа ад 17 красавіка 1905 г. / М. М. Кароль // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. – Мінск, 2018. – Вып. 16. – С. 148–158.

4. Кароль, М. М. Рэлігійная самаідэнтыфікацыя пераведзенага ў праваслаўе насельніцтва Навагрудскага павета Мінскай губерні ў другой палове XIX – пачатку XX стст. / М. М. Кароль // Acta Anniversaria: зб. навук. прац Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». – Нясвіж, 2018. – Т. 4. – С. 160–173.

5. Кароль, М. М. Змена матрыманіяльнага статусу як прычына міжканфесійных канверсій у беларускіх губернях Расійскай імперыі ў канцы XIX – пачатку XX ст. / М. М. Кароль // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. – Мінск, 2019. – Вып. 17. – С. 160–169.

6. Кароль, М. М. Міжканфесійныя канверсіі ў Ваўкавыскім павеце Гродзенскай губерні ў другой палове XIX ст. / М. М. Кароль // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. – Мінск, 2020. – Вып. 18. – С. 221–230.

7. Кароль, М. М. Канфесійныя канверсіі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.: агляд гістарыяграфіі / М. М. Кароль // Журнал Белорусского государственного университета. История. – 2021. – № 1. – С. 82–89.

### Артыкулы ў іншых навуковых выданнях

8. Кароль, М. М. Супраціўленне пераводу ў праваслаўе каталіцкага насельніцтва беларускіх губерняў пасля паўстання 1863–1864 гадоў: вобраз

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



«падбухторшчыкаў» у расійскім афіцыйным дыскурсе / М. М. Кароль // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории : сб. науч. тр. / ГУО «Республиканский институт высшей школы»; редкол. : И. А. Марзалюк (пред.) [и др.]. – Минск, 2017. – Вып. 1. – С. 165–173.

9. Кароль, М. М. Адлюстраванне міжканфесійных пераходаў у перыядычным друку беларускіх губерняў у пачатку XX стагоддзя / М. М. Кароль // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории : сб. науч. ст. / ГУО «Республиканский институт высшей школы»; редкол. : И. А. Марзалюк (пред.) [и др.]. – Минск, 2018. – Вып. 2. – С. 183–187.

**Артыкулы ў зборніках навуковых канферэнцый**

10. Кароль, М. М. Супраціўленне пераводу каталікоў у праваслаўе у Мінскай губерні ў другой палове XIX ст. (па матэрыялах НГАБ) / М. М. Кароль // Актуальные проблемы источниковедения : мат-лы IV Междунар. науч.-практ. конф. к 420-летию дарования городу Витебску магдебургского права, Витебск, 20–21 апреля, 2017 / Витеб. гос. ун-т; редкол. : А. Н. Дулов и М. Ф. Румянцева (отв. ред.) [и др.]. – Витебск, 2017. – С. 197–199.

11. Кароль, М. М. Палітыка расійскіх улад па трансфармацыі сацыякультурнага ландшафту ў беларускіх губернях пасля паўстання 1863–1864 гг. / М. М. Кароль // XIX Республиканская научно-практическая конференция молодых ученых: сб. материалов, Брест, 12 мая 2017 г. / М-во образования Республики Беларусь; Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина; под общ. ред. А. Е. Будько. – Брест, 2017. – С. 182–184.

12. Кароль, М. М. Рэакцыя ўлад на супраціўленне пераводу з каталіцызму ў праваслаўе ў беларускіх губернях у другой палове XIX ст. / М. М. Кароль // XI Машеровские чтения: материалы междунар. науч.-практич. конф. студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 18 окт. 2017 г. / Витеб. гос. ун-т; редкол. : И. М. Прищепа [и др.]. – Витебск, 2017. – С. 137–139.

13. Кароль, М. М. Роля жанчын у захаванні каталіцкай ідэнтычнасці насельніцтва беларускіх губерняў у другой палове XIX – пачатку XX ст. / М. М. Кароль // 75-я научная конференция студентов и аспирантов Белорусского государственного университета: материалы конф., Минск, 14–23 мая 2018 г. В 3-х ч. – Минск, 2018. – Ч. 1. – С. 186–189.

14. Король, М. М. Отношение населения к переводу в православие на территории Витебской губернии во второй половине XIX – начале XX вв. / М. М. Король // Студенческое сообщество и современная наука: материалы

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



Междунар. науч.-практич. конф. студентов, аспирантов и молодых ученых, Елец, 6–12 апр. 2018 г. / ЕГУ им. И. А. Бунина. – Елец, 2018. – Вып. 4 / Под ред. Д. В. Щукина. – С. 115–120.

15. Кароль, М. М. «Усердие к латинству»: супрацiўленне пераводу ў праваслаўе ў Падзвiнскiм рэгiёне ў другой палове XIX – пачатку XX ст. [Электронны рэсурс] / М. М. Кароль // Беларускае Падзвiнне: вопыт, методыка i вынiкi палявых i мiждысцыплiнарных даследаванняў: электрон. зб. навук. арт. IV мiжнар. навук. канф. да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўнiверсiтэта, Полацк, 19–20 крас. 2018 г. / Полацкi дзярж. ун-т ; пад агул. рэд. А. I. Корсак. – Наваполацк, 2018. – С. 601–606. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).

16. Кароль, М. М. Праблематыка мiжканфесiйных пераходаў у другой палове XIX – пачатку XX ст. : перспектывы даследавання на матэрыялах Нацыянальнага гiстарычнага архiва Беларусi // Беларускiя архiвы на мяжы тысячагоддзяў: здабыткi i страты : матэрыялы навук.-практ. канф., прысвечанай 80-годдзю Нацыянальнага гiстарычнага архiва Беларусi, Мiнск, 28 чэрвеня 2018 г. / Дэпартамент па архiвах i справаводству; Мiн. юстыцыi Рэспублiкi Беларусь; Нац. гiст. архiў; Iн-т гiсторыi НАН Беларусi; рэдкал. : В. I. Кураш (старшыня) [i iнш.]. – Мiнск, 2019. – С. 128–133.

17. Кароль, М. М. Мiжканфесiйныя канверсii ў 60-я гады XIX стагоддзя: сацыяльнае аблiчча «ўпартых» / М. М. Кароль // Беларусь у гiстарычнай рэтраспектыве XIX–XX стагоддзяў: этнакультурныя i нацыянальна-дзяржаўныя працэсы : матэрыялы Рэсп. навук. канф., Гомель, 3 кастр. 2019 г. / Мiн. адук. Рэспублiкi Беларусь, УА «Гомельскi дзярж. ун-т iмя Ф. Скарыны»; рэдкал. : А. Р. Яшчанка (гал. рэд.) [i iнш.]. – Гомель, 2019. – С. 53–57.

18. Кароль, М. М. Адлюстраванне праблемы мiжканфесiйных пераходаў у дарэвалюцыйнай гiстарыяграфii i грамадскай думцы / М. М. Кароль // Беларусь у кантэксце еўрапейскай гiсторыi: асоба, грамадства, дзяржава : зб. навук. арт., прысвечаны 80-годдзю Гродзенскага дзярж. ун-та iмя Я. Купалы i 65-годдзю гiстарычнай адукацыi ў Гродзен. дзярж. ун-це iмя Я. Купалы [выданне падрыхтавана па вынiках Мiжнар. навук. канф. «Беларусь у кантэксце еўрапейскай гiсторыi: грамадства, дзяржава, асоба», люты, 2019 г.]. У 2 ч. / УА «Гродзенскi дзярж. ун-т iмя Янкi Купалы»; рэдкал. : А. А. Каваленя, I. Ф. Кiтурка (гал. рэд.) [i iнш.]. – Гродна, 2019. – Ч. 1. – С. 62–65.

19. Кароль, М. М. Захаванне каталiцкай канфесiйнай iдэнтычнасцi пераведзеным у праваслаўе насельнiцтвам (другая палова XIX – пачатак XX ст.): прыклад Валмянскай парафii Мiнскага павета / М. М. Кароль // Беларусь у эпоху геапалiтычных i сацыяльных зрухаў Новага i Навейшага часу. Да 25-годдзя кафедры гiсторыi Беларусi новага i навейшага часу гiстарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўнiверсiтэта : матэрыялы

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 22 лістап. 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал. : А. Г. Каханоўскі (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2019. – С. 111–115.

20. Кароль, М. М. Самотны прапаведнік ці «агент ксяндза»: выпадак міжканфесійнай напружанасці ў Дзісенскім павеце ў канцы XIX – пачатку XX ст. / М. М. Кароль // Православие в Беларуси XIX–XX вв. : Материалы междунар. науч. конф., г. Минск, 1 ноября 2019 г. / Белорусская Православная Церковь, Нац. акад. наук Беларуси, Отделение гуманитарных наук и искусств НАН Беларуси, Ин-т истории НАН Беларуси, Минская духовная академия. – Минск, 2020. – С. 94–99.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## РЭЗЮМЭ


**Кароль Маргарыта Міхайлаўна**
**Перавод каталіцкага насельніцтва Беларусі ў праваслаўе (1863–1914 гг.)**

**Ключавыя словы:** праваслаўе, каталіцызм, канфесійныя канверсіі, рэлігійная палітыка, празелітызм, свабода сумлення.

**Мэта даследавання:** раскрыццё працэсу ажыццяўлення канфесійных канверсій праваслаўнага і каталіцкага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў 1863–1914 гг.

**Метады даследавання:** агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз, узыходжанне ад канкрэтнага да абстрактнага, узыходжанне ад абстрактнага да канкрэтнага); спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнаўчы і гісторыка-тыпалагічны); метады мікрагісторыі.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** На падставе шырокага кола крыніц упершыню ў гістарыяграфіі ўсебакова акрэслены асаблівасці пераводу каталіцкага насельніцтва ў праваслаўе на тэрыторыі беларускіх губерняў у 1863–1905 гг.; вызначаны колькасны склад пераведзеных у праваслаўе, прааналізаваны працэс вяртання ў каталіцызм часткі пераведзеных у 1905–1914 гг.; выяўлены спосабы негвалтоўнага супраціўлення насельніцтва пераводам, вызначаны рэгіёны, дзе адзначалася масавае супраціўленне пераводу ў праваслаўе. Упершыню ў айчыннай гістарычнай навуцы вылучаны і разгледжаны формы захавання пераведзенымі ў праваслаўе традыцыйнай для іх каталіцкай канфесійнай ідэнтычнасці, прасочаны выпадкі яе наяўнасці на працягу доўгага перыяду пасля фармальнага пераводу ў праваслаўе.

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў.** Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы падручнікаў і навучальных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі, вучэбных курсаў па гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст., гісторыі канфесій у Беларусі; для далейшага вывучэння гісторыі канфесій на беларускіх землях у другой палове XIX – пачатку XX ст., міжканфесійных адносін і ажыццяўлення рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі ў беларускіх губернях.

**Галіна выкарыстання:** гісторыя Беларусі, гісторыя канфесій, гісторыя культуры, сацыяльная гісторыя.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



# РЕЗЮМЕ

**Король Маргарита Михайловна**
**Перевод католического населения Беларуси в православие (1863–1914 гг.)**

**Ключевые слова:** православие, католицизм, конфессиональные конверсии, религиозная политика, прозелитизм, свобода совести.

**Цель исследования:** раскрытие процесса осуществления конфессиональных конверсий православного и католического населения на территории Беларуси в 1863–1914 гг.

**Методы исследования:** общенаучные (анализ, синтез, восхождение от конкретного к абстрактному, восхождение от абстрактного к конкретному); специально-исторические (историко-генетический, историко-сравнительный и историко-типологический); методы микроистории.

**Полученные результаты и их новизна.** На основании широкого круга источников впервые в историографии всесторонне очерчены особенности перевода католического населения в православие на территории белорусских губерний в 1863–1905 гг.; определен количественный состав переведенных в православие, проанализирован процесс возвращения в католицизм части переведенных в 1905–1914 гг.; выявлены способы ненасильственного сопротивления населения переводам, определены регионы, в которых отмечалось массовое сопротивление переводу в православие. Впервые в отечественной исторической науке выделены и рассмотрены формы сохранения переведенными в православие традиционной для их католической конфессиональной идентичности, прослежены случаи ее наличия на протяжении длительного периода после формального перевода в православие.

**Рекомендации по практическому использованию результатов.** Результаты диссертационного исследования могут быть использованы при подготовке учебников и учебных пособий по истории Беларуси, учебных курсов по истории Беларуси XIX – начала XX в., истории конфессий в Беларуси; для дальнейшего изучения истории конфессий на белорусских землях во второй половине XIX – начале XX в., межконфессиональных отношений и осуществления религиозной политики Российской империи в белорусских губерниях.

**Область использования:** история Беларуси, история конфессий, история культуры, социальная история.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



# SUMMARY


**Karol Marharyta Mikhailauna**
**The conversion of the Catholic population to Orthodoxy in Belarus (1863–1914)**

**Key words:** Orthodoxy, Catholicism, confessional conversions, religious policy, proselytism, freedom of conscience.

**Aim of the research:** to reveal the process of carrying out confessional conversions of the Orthodox and Catholic population on the territory of Belarus in 1863–1914.

**Research methods:** general scientific (analysis, synthesis, ascent from concrete to abstract, ascent from abstract to concrete); special-historical (historical-genetic, historical-comparative and historical-typological); methods of microhistory.

**Obtained results and their novelty.** On the basis of a wide range of sources for the first time in historiography, the features of the conversion of the Catholic population to Orthodoxy on the territory of the Belarusian provinces in 1863–1905 have been comprehensively outlined; the quantitative composition of those transferred to Orthodoxy was determined, the process of returning to Catholicism of a part of those who were translated in 1905–1914 was analyzed; the methods of nonviolent resistance of the population to the translations were revealed, the regions in which there was a massive resistance to the conversion to Orthodoxy were identified. For the first time in the Belarusian historical science, the forms of preservation of the traditional Catholic confessional identity by those translated into Orthodoxy are identified and considered, cases of its presence are traced for a long period after the formal transfer to Orthodoxy.

**Recommendations for the practical application of the results.** The results of the dissertation research can be used in the preparation of textbooks on the history of Belarus, training courses on the history of Belarus in the 19th – early 20th centuries, the history of confessions in Belarus; for further study of the history of confessions in the Belarusian lands in the second half of the 19th – early 20th centuries, interfaith relations and the implementation of the religious policy of the Russian Empire in the Belarusian provinces.

**Sphere of application:** history of Belarus, history of confessions, history of culture, social history.